ДЗЯРЖЫНШЧЫНА ЛІТАРАТУРНАЯ
Інфармацыйны матэрыял для педагогаў

Невялікае пажарожжа па шырокай Брэсцкай шашы – і вось мы на тэрыторыі Дзяржынскага раёна. Паабапал мільгаюць прысады, засеяныя палеткі, вёскі, рукамі, працаю жыхароў якіх дбайна дагледжана зямля.

У духоўным жыцці нашай краіны Дзяржыншчына слаўная перш за ўсё імёнамі беларускіх вучоных. З тутэйшых хат сцяжынкі жыцця ішлі ў шырокі шлях навукоўцы М.Бірыла, Ф.Марцінкевіч, М.Міцкевіч, В. Івашын, В.Валадзько, М.Улашчык, А.Сабалеўскі, А.Семяновіч, А.Шот.... Спіс гэты можна доўжыць далей. І наўрад ці знойдзецца на Беларусі яшчэ такі раён, які б даў бы ёй такое сузор’е розных па спецыяльнасці, напрамках вучоных.

Дзяржыншчына ўзгадавала цэлую плеяду беларускіх пісьменнікаў. Шырока вядомы за яе межамі імёны Ст. Шушкевіча, А. Вольскага, А.Рыбака, М.Ермаловіча,Л.Калюгі, К.Каганца....

І вось – **Дзяржынск.** Тут нарадзіліся і ступілі ў шырокі свет літаратуры А.Вольскі, А.Глобус, Ю.Брайдэр, у гарадскім вучылішчы Койданава вучыўся беларускі байкапісец Кандрат Крапіва, койданаўскія кірамшы наведваў Змітрок Бядуля.

**Брайдэр Юрый Міхайлавіч** - пісьменнік-фантаст. Нарадзіўся 8 студзеня 1948 года. Пісаў у сааўтарстве з Мікалаем Чадовічам.

Скончыў Мінскі тэхнікум сувязі. Працаваў у органах МУС – даслужыўся да звання маёра і выйшаў на пенсію.

З 1996 года член Літаратурнага Журы прэміі «Страннік». Узнагароджаны жанравымі прызамі прэстыжнай расійскай прэміі ў вобласці фантастыкі «Страннік».

У 1998 годзе яму ўручаны «Меч Руматы» за прыгодніцкі раман «Между плахой и секирой». У 2003 годзе на міжнародным фестывалі фантастыкі «Звёздный мост-2003» раман Ю. Брайдэра «Гвоздь в башке» быў прызнаны лепшым сярод 94 раманаў у намінацыі «Крупная форма» і стаў яго лаурэатам. Гэты ж раман у 2003 годзе на 8 кангрэсе фантастаў Расіі атрымаў прэмію “Меч в зеркале”.

У 2003 годзе Юрый Брайдэр стаў пераможцам конкурса «Эпиграмма-Ф».

Кнігі Юрыя Брайдэра выходзяць тыражом 12-15 тысяч экзэмпляраў. Его творы перакладзены на многія мовы свету.

У творах Юрыя Брайдэра спалучаецца цікавасць да вострага парадаксальнага сюжэта, жыццёвая назіральнасць пісьменніка-рэаліста, талент сатырыка.

**Вольскі Артур** (Артур Вітальевіч Зэйдэль-Вольскі), нарадзіўся 23 верасня 1924 года у Дзяржынску. Беларускі пісьменнік. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы (1938-1941), працаваў мастаком у БДТ-2 (Уральск). У 1942 годзе прызваны ў Ваенна-марскі флот. Служыў на Далёкім Усходзе. З 1963 года- загадчык літаратурна-педагагічнай часткі, з 1966 г. па 1978 г. дырэктар Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, з 1978 г. дырэктар Дома літаратара, з 1980 г. літкансультант Саюза пісьменнікаў БССР. У 1981-1984 гг. старшы рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1955 г. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалём «За баявыя заслугі» і іншымі медалямі.

Першы літаратурны твор надрукаваў у 1937 годзе. Напісаў на рускай мове аповесць «Родная семья» (Хабараўск, 1953, з Б. Іртышскім).

Аўтар зборнікаў паэзіі «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958), «Далёкія і блізкія прычалы» (1962), «Дабрата» (1966), «Выратавальны круг» (1974), «Строма» (1982), «Чалавек, якому баліць» (1984), «Наваселле дрэў» (1990).

Напісаў кніжкі паэзіі, прозы, казак для дзяцей «Маленькім сябрам» (1955), «Дзедаў госць» (1958), «Чырвоная зорка» (1961), «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікратое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Жывыя літары» (1973), «А куды падаўся дождж» (1974), «Ізумрудны горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1984), «Ад А да Я- прафесія мая (1987), апавяданне-эсе «Хлеб – усяму галава» (1989). Кнігі выбраных твораў выходзілі ў 1971, 1974 гг.

Сумесна з П. Макалём напісаў п'есы «За лясамі дрымучымі» (1959), «Марынка-крапіўніца» (пастаўлена ў 1962). У сааўтарстве з Э. Доўнер напісаў кінасцэнарый «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка» (пастаўлены у 1978).

Аўтар п'ес-казак «Сцяпан – вялікі пан» (1979), «Тры Іваны – тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989).

П’еса-казка “Сцяпан – вялікі пан”, пакладзеная на музыку Ю.Семянякам і пастаўленая ў 1979 г. на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі, з'явілася першай беларускай аперэтай для дзяцей.

На Беларускім тэлебачанні пастаўлены спектаклі «Апошняя ноч Алаізы» (1986), «Водар папараці» (1989). Койданаўскай бітве сярэдзіны XIII ст. прысвяціў паэму «Паланянка» (1962). Перакладаў з рускай,украінскай, літоўскай, латышскай, яўрэйскай, нямецкай моў.

Памёр 5 верасня 2002 года.

**Глобус Адам** (Уладзімір Вячаслававіч Адамчык), нарадзіўся 29 верасня 1958 года ў Дзяржынску ў сям'і пісьменніка. Беларускі пісьменнік. У 1959 годзе з бацькамі пераехаў у Мінск. Вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы на педагагічным аддзяленні (1973-1977). Пасля заканчэння вучылішча паступіў на мастацкае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (закончыў у 1983). Працаваў чарцёжнікам, мастаком- рэстаўратарам, мастаком-афарміцелем. З 1987 г.- рэдактар у часопісе «Крыніца» («Роднік»). Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1988 г. Працуе ў галіне паэзіі і прозы. У друку пачаў выступаць з вершамі ў 1981 г. (газета «Літаратура і мастацтва», часопіс «Маладосць»). Аўтар кнігі паэзіі «Парк» (1988) і зборніка апавяданняў «Адзінота на стадыёне» (1989).

Жыве ў Мінску.

**Рыбак Алесь (Аляксандр Пятровіч),** нарадзіўся 7 лістапада 1934 года ў в. Макаўчыцы ў сялянскай сям'і. Беларускі пісьменнік. Рана застаўся без бацькоў – загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У 1958г. закончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна. Працаваў у рэдакцыях радашковіцкай, дзяржынскай і бягомльскай раённых газет, часопісе «Вожык», газеце «Калгасная праўда», на Беларускім радыё, у часопісе «Бярозка». З 1966 г. да 1972 г. жыў у Маскве – працаваў старшым карэктарам у Аддзеле апублікавання Актаў Вярхоўнага Савета СССР, рэферэнтам у сакрытарыяце

Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Па сумяшчальніцтве выкладаў беларускую мову ў Літаратурным інстытуце імя М.Горкага. З 1972 г. намеснік адказнага сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, з 1978 г. старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1973 г. Дэбютаваў вершамі ў рэспубліканскім друку ў 1953г.

Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Дарогі бываюць розныя», «Што пасееш», «Апошняя камандзіроўка», рамана «Трэба было жыць», "Галаброды". Выдаў кніжку апавяданняў для дзяцей «Сёння прыедзе тата».

Жыве ў Мінску.

На паўднёвым захадзе, у некалькіх кіламетрах ад Дзяржынска, знаходзіцца вёска **Дзягільна**. Тут пахаваны знакаміты беларускі падарожнік, пісьменнік Адольф Янушкевіч.

**Янушкевіч Адольф Міхал Валяр'ян Юліян,** нарадзіўся 9 чэрвеня 1803 г. ў Нясвіжы. Падарожнік, пісьменнік. Вучыўся ў дамініканскай школе ў Нясвіжы, у 1823 скончыў філалагічны факультэт Віленскага універсітэта. У 1823-1826 гг. жыў у Камянцы, быў дэпутатам цывільнай палаты ў Галоўным судзе. Падарожнічаў па Італіі, Германіі, Францыі, сустракаўся з А.Міцкевічам, Ю.Славацкім, І.Гётэ.У 1830 г. вярнуўся на радзіму. У час паўстання 1830-1831 гг. быў адным з кіраўнікоў легіёна Літвы,Валыні, Падоліі і Украіны. У 1832 г. сасланы ў Сібір. Падарожнічаў па Сібіры, Казахстане, Кіргізіі. У 1856 г. вярнуўся на Беларусь у маёнтак бацькоў Дзягільна. У студэнцкія гады пісаў на польскай мове сентыментальныя вершы (дума «Мелітон і Эвеліна»), у ссылцы перакладаў «Гісторыю заваявання Англіі нарманамі» А.Цьера. Яго падарожныя нататкі сабраў брат Яўстафій, выдаў Ф. Вратноўскі пад назвай «Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лісты з кіргізскіх стэпаў» (кн.1-2, Парыж, 1861). У дзённікавых запісах і лістах раскрыўся яго талент апавядальніка і сумленнага даследчыка. У іх ён апісаў побыт казахаў, іх духоўную культуру, выступаў як абаронца казахаў ад самавольства баяў і царскай адміністрацыі. Янушкевіч паслужыў прататыпам рэвалюцыянера Адольфа ў паэме Міцкевіча «Дзяды».

Памёр 6 чэрвеня 1857 г. Пахаваны ў в. Дзягільна.

Некалькі хвілін язды па Брэсцкай шашы прыводзяць нас у вёску **Бакінава**, малую радзіму вядомага беларускага пісьменніка Ст. Шушкевіча.

**Шушкевіч Станіслаў Пятровіч**, нарадзіўся 19 лютага 1908 года у в. Бакінава. Беларускі паэт, празаік. Бацька вучонага-фізіка і дзяржаўнага дзеяча С.С.Шушкевіча. У 1926-1928 гг. вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме, у 1934 г. закончыў крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску. Быў членам літаратурных арганізацый «Маладняк», БелАПП. Працаваў у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР, у 1928- 1931 гг. загадваў бібліятэкай навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі імя У.І.Леніна, у рэдакцыях газет «Літаратура і мастацтва», «Калгаснік Беларусі», «Звязда». 15 лістапада 1936 г. быў беспадстаўна арыштаваны, асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі, Знаходзіўся ў турме, лагеры, ссылцы ў Сібіры, дзе працаваў шахцёрам, цеслем, бухгалтарам у лагеры МУС Кемераўскай вобласці, пасля вызвалення ў 1944 г. – вольнанаёмным бухгалтарам саўгаса. У 1946- 1949 гг. працаваў настаўнікам Данілавіцкай СШ Дзяржынскага раёна. У 1949 г. паўторна арыштаваны і высланы на спецпасяленне ў Краснаярскі край,дзе працаваў лесарубам, у геалагічных партыях і

экспедыцыях. У 1956- 1958 гг. супрацоўнік газеты «Мінская праўда», у 1958-1970 гг. загадчык аддзела газеты «Літаратура і мастацтва». Канчаткова па абедзвюх справах рэабілітаваны 26 верасня 1975 г. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1934 г. Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР. Узнагароджаны медалямі. Друкаваўся з 1924 г. Аўтар зборнікаў «Вершы», «Дарогаю вясны», «Услед за марамі» і інш; кнігі ўспамінаў «Вяртанне ў маладосць»; зборніка сатыры і гумару «Грушы на вярбе»; кніжак вершаў, апавяданняў і казак для дзяцей «Звярыны баль», «Лясная калыханка», «Сарочы церамок», «Гара Марата Казея» і інш.

Памёр 1 лютага 1991 года.

Крыху далей, злева ад шашы раскінуўся гарадскі пасёлак **Негарэлае,** знакамітае чыгуначнай станцыяй, якая да 1939 года была апошняй прыгранічнай станцыяй, фарпостам Савецкай дзяржавы. З негарэлым звязаны імёны славутых дзеячоў культуры. Чатыры разы – у 1928, 1929. 1931 і 1932 гадах тут праязджаў і спыняўся Максім Горкі, якога віталі Янка Купала і іншыя беларускія пісьменнікі.

Праездам у Негарэлым спыняліся Ул. Маякоўскі, А. Талстой, А.Фадзееў. У. Вішнеўскі, замежныя пісьменнікі Рамэн Ралан, Анры Барбюс, Бертольд Брэхт, Юліус Фучык, Марыя Пуйманава, знакаміты спявак і грамадскі дзеяч Поль Робсан.

Негарэлае ўзгадавала беларускага гісторыка-журналіста, пісьменніка А.Валахановіча.

**Валахановіч Анатоль Іосіфавіч,** нарадзіўся 17 красавіка 1939 г. у Мінску. Беларускі гісторык-журналіст, краязнавец, пісьменнік. Закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (1961). Член Беларускага саюза журналістаў (1975). У 1961-1962 гг. настаўнік гісторыі Бараўской СШ, з мая 1962 г. адначасова дырэктар Паланевіцкай НСШ, з 1964 г. дырэктар Ракашыцкай 8-гадовай школы, са жніўня 1966 г. дырэктар Зенькавіцкай СШ Уздзенскага раёна. З верасня 1968 г. рэдактар у выдавецтве «Беларуская Савецкая энцыклапедыя», з лютага 1975 г. загадчык рэдакцыі літаратуры па гісторыі і праве выдавецтва «Навука і тэхніка» АН БССР, з мая 1996 г. па 2002 г. старшы навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы. Пісаць і друкавацца пачаў ў 1959 г. Даследуе праблемы гісторыі, літаратуры, культуры і краязнаўства Беларусі, распрацоўвае пытанні палітычных рэпрэсій, займаецца гісторыяй хрысціянства на Беларусі. Аўтар навуковых і навукова-папулярных кніг: «Дзяржынск: Гісторыка-эканамічны нарыс», «Дзяржыншчына: Мінулае і сучаснае» (у сааўт. З А.М. Кулагіным), «Клічаўшчына: Гісторыка-эканамічны нарыс» ( у сааўт. з І.І. Саўчанкам ), «Партызанскі генерал з Амерыкі», «Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі: Кароткі нарыс жыцця і дзейнасці», «Споведзь у надзеі застацца жывым: Аўтабіяграфія Браніслава Тарашкевіча ( у сааўт, з У.М. Міхнюком), «Графы фон Гутэн-Чапскія на Беларусі», адзін з аўтараў, рэдактараў і складальнікаў кніг «Хто ёсць хто у Рэспубліцы Беларусь», «Памяць. Старадарожскі раён» і «Памяць. Дзяржынскі раён», адзін з аўтараў кнігі «Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі: Гісторыя ў біяграфіях рэктараў, вучоных, удастоеных ганаровых званняў, лаўрэатаў прэмій, прафесароў, дактароў навук: 40 гадоў (1964-2004), «Валмянскі сельскі Савет: Гістарычны нарыс» ( у сааўт. з А.В. Рудовічам) і інш. Аўтар звыш 400 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у энцыклапедычных выданнях, навуковых зборніках, матэрыялах

навуковых канферэнцый, часопісах, газетах, кнігах. Піша аповесці, апавяданні, эсэ, дакументальныя нарысы, казкі.

Жыве ў Мінску.

Побач з Негарэлым – вёска Клачкі, дзе жыла беларуская паэтэса і журналіст Таццяна Дзмітрусёва.

**ДЗМІТРУСЁВА Таццяна Паўлаўна**, нарадзілася 1.01.1948 г. у в. Сцюдзянец Касцюковіцкага раёна. Беларуская паэтэса, журналіст. Пасля заканчэння БДУ (1977г.) працавала загадчыкам літаратурнага аддзела газеты “Чырвоная Змена”, намеснікам рэдактара газеты “Піянер Беларусі”, потым газеты “Культура”, рэдактарам газеты “Кнігарня”, пазней працавала ў “Настаўніцкай газеце”. Аўтар двух паэтычных зборнікаў “Асеннія святы” і “Зажынкі”. Шэрагам сваіх нарысаў стварыла славутую галерэю творчых партрэтаў беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў. У апошні час жыла ў в. Клачкі Дзяржынскага раёна. Памерла ў 1998 годзе.

З Негарэлага дарога вядзе нас у **в. Ляхавічы**, радзіму беларускага літаратуразнаўцы, педагога В.У.Івашына.

**ІВАШЫН Васіль Уладзіміравіч** нарадзіўся 9 мая 1913 года ў вёсцы Ляхавічы. Беларускі літаратуразнавец, педагог, акадэмік АПН СССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут. З 1946 г. у Інстытуце літаратуры АН Беларусі, 1967-1978 г.г. дырэктар НДІ педагогікі Міністэрства адукацыі Беларусі. Адзін з галоўных кірункаў даследаванняў – Купалаўская спадчына. Аўтар манаграфій “М.Горкі і беларуская літаратура пачатку ХХ ст.”, “Да вышынь рэалізму”, падручнікаў “Беларуская літаратура” для 8-га класа і 9-га класа (у сааўтарстве з М.А.Лазаруком і В.В.Барысенкам).

З Ляхавіч выязджаем на шашу Брэст – Мінск, потым паварочваем на на Станькава. Застаецца ззаду вёска **Кукшавічы,** радзіма беларускага паэта Генадзя Тумаша.

**Тумаш Генадзь (Тумас Яўген Змітравіч),** нарадзіўся 28 ліпеня 1940 г. у в. Кукшавічы. Беларускі паэт. Закончыў БДУ (1964). Працаваў у школе, Інстытуце мовазнаўства НАН Беларусі, на Беларускім тэлебачанні. З 1974 г. - у Літаратурным музеі Я.Коласа, з 1987 г. у Саюзе беларускіх пісьменнікаў, у 1994-2002 гг. у Беларускім універсітэце культуры. Друкуецца з 1957 г. У паэтычным зборніку “Лінкос” (1970) звярнуўся да гісторыі сваёй зямлі, нацыянальнай праблематыкі. Кніга “Родны бераг песняра: Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я.Коласа” (1982) напісана на багатым фактычным, архіўным матэрыяле, успамінах землякоў паэта. Аўтар літаратуразнаўчых артыкулаў. На беларускую мову пераклаў творы В.Каратынскага, Я.Лучыны, У.Мэя. Піша для дзяцей: кніга “Лісіца з Расохі”(2001).

І вось – **Станькава,** вядомае сваім помнікам садова-паркавага мастацтва - сядзібай графаў Чапскіх, а таксама як радзіма Героя Савецкага Саюза Марата Казея. Непадалёк ад Станькава знаходзіцца вёска **Крысава**, дзе нарадзіўся беларускі паэт Алесь Салавей.

**Салавей Алесь (Альфрэд Васільевіч Радзюк),** нарадзіўся 1 студзеня 1922 г. ў в. Крысава. Беларускі паэт. Вучыўся ў Мінскім педагагічным вучылішчы

(1937-1938). Вучобу пакінуў з-за арышту бацькоў (трэба было ўзяць на сябе клопат пра малодшых братоў і сястру). У час акупацыі працаваў вярстальшчыкам у «Менскай (Беларускай) газэце», затым пісарам ва ўправе гарадскога пасёлка Ільля. З кастрычніка 1942 г. сакратар часопіса «Новы шлях» (Рыга). Пад час наступлення Савецкай арміі (1944) з'ехаў у Берлін. Затым у Прагу, потым ў Вену. У 1949г.выехаў у Аўстралію, дзе працаваў на фабрыцы, займаўся літаратурнай дзейнасцю. Першыя вершы апублікаваў у 1937 г. (часопіс «Піянер Беларусі», раённая газета «Ударнік Дзяржыншчыны». Аўтар кніг паэзіі «Мае песні» (вершы і паэма, Рыга,1944), «Сіла гневу» (вершы, паэма, Аўстрыя,1948), «Нятускная краса» (Нью-Йорк –Мельбурн , 1982).

Памёр 22 студзеня 1978 г. у Мельбурне (Аўстралія).

Са Станькава дарога вядзе нас да вёскі Дабрынёва. Паварочваем налева і, праз колькі кіламетраў, трапляем у вёску з цікавай назвай **Скварцы,** з якой пайшоў ў жыццё беларускі пісьменнік Лукаш Калюга.

**Калюга Лукаш (Канстанцін Пятровіч Вашына),** нарадзіўся 27 верасня 1909 г. у в. Скварцы. Беларускі пісьменнік. У 1931 г. закончыў Беларускі педагагічны тэхнікум. Працаваў стыльрэдактарам у навукова-даследчым Інстытуце прамысловасці ВСНГ БССР, на Беларускім радыё. Уваходзіў у літаратурнае аб’яднанне “Узвышша”. У студзені 1933 г. рэпрэсіраваны, асуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі. Тэмін адбываў у Ірбіце Свярдлоўскай вобласці. Паўторна арыштаваны 2 кастрычніка 1937 г. Рэабілітаваны 24 жніўня 1956 г. Вярхоўным судом БССР, па справе другога арышту – 22 снежня 1965 г. Чэлябінскім абласным судом. Першыя апавяданні надрукаваў у 1927 г. (часопіс “Чырвоны сейбіт”). У 1928 г. часопіс “Узвышша” змясціў аповесць “Ні госць, ні гаспадар”, у 1929 г. – шэраг апавяданняў. У часопісе “Полымя” за 1931 г. была надрукавана першая частка аповесці “Нядоля Заблоцкіх” – “Прыгоды і летуценні”. У 1974 г. выйшаў зборнік апавяданняў і аповесцей “Ні госць, ні гаспадар”. Падборку апавяданняў змясціў часопіс “Полымя” ў 1988г.

Пераклаў аповесць П.Панча “Блакітныя эшалоны” (з К.Чорным, 1930), раман Ю.Алешы “Зайздрасць” (1931), раман Я.Гашака “Прыгоды ўдалага ваякі Швейка”.

Расстраляны 2 кастрычніка 1937 г.

Непадалёк ад Скварцоў размяшчаецца невялікая вёсачка **Шабунеўшчына,** радзіма беларускага крытыка і літаратуразнаўцы А.А.Семяновіча.

**СЕМЯНОВІЧ Антон Аляксандравіч** нарадзіўся 5 жніўня 1917 года ў вёсцы Шабунеўшчына. Беларускі крытык і літаратуразнавец, дактар філалагічных навук, прафесар. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут. Настаўнічаў, працаваў у Інстытуце літаратуры АН Беларусі, выкладаў беларускую літаратуру ў БДУ, з 1963 г. у Мінскім педагагічным універсітэце. Друкаваўся з 1949 г. Даследаваў беларускую прозу і драматургію. Адзін з аўтараў “Гісторыі беларускай савецкай літаратуры” (т.1-2, 1965-1966), “Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры” (т.2, 1969), падручнікаў для студэнтаў па гісторыі беларускай літаратуры і інш.

Памёр 25 жніўня 2000 года.

На поўнач ад Дзяржынска, па шашы Дзяржынск – Заслаўль, знаходзіцца вёска **Малыя Навасёлкі**, радзіма беларускага літаратуразнаўцы, гісторыка, пісьменніка Міколы Ермаловіча.

**Ермаловіч Мікалай Іванавіч,** нарадзіўся 29 красавіка 1921 г. у в. Малыя Навасёлкі. Беларускі гісторык і літаратуразнавец, пісьменнік.

У 1938 г. паступіў на беларускае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М.Горкага. Да вайны скончыў тры курсы. У 1941-1943гг. працаваў настаўнікам у Мардоўскай АССР. У 1943-1944гг. на педагагічнай працы ў Суражы Віцебскай вобласці, у 1944- 1946 гг.- у Дзяржынску. У 1946 г. аднавіў вучобу ў педінстытуце. Пасля заканчэння (1947) быў залічаны ў аспірантуру пры педінстытуце. З 1948 па 1955гг. працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце, а пасля яго закрыцця быў загадчыкам метадычнага кабінета Маладзечанскага абласнога інстытута удасканалення настаўнікаў. У канцы 1957г. па стану здароўя выйшаў на пенсію. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1989г. Галоўныя тэмы творчасці – гісторыя Беларусі IX-XIV ст. і беларуская літаратура. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1992г.) Аўтар кніг: “Старажытная Беларусь: Полацкі і навагародскі перыяды”, “Па слядах аднаго міфа”, “Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд”.

Памёр 5 сакавіка 2000г. Помнік М.І.Ермаловічу пастаўлены ў 2003 г. у г. Маладзечна і ў г. Старыя Дарогі.

Тут жа, на хутары паблізу в. Малыя Навасёлкі, нарадзілася беларуская паэтэса Ніна Жыбрык (Умецкая).

**ЖЫБРЫК (УМЕЦКАЯ) Ніна Іосіфаўна**, нарадзілася 21.03.1933 г. у 1954 годзе закончыла Дзяржынскую СШ, потым БДУ. Аўтар шматлікіх паэтычных зборнікаў – “Лясная крыніца”, “Верасовая паляна”, “Першы снег”, “Грыбны дождж” і інш. Піша лірычныя, патрыятычныя, філасофска-этычныя творы. Жыве ў пасёлку Мачалішча Звянігаўскага раёна Рэспублікі Марый Эл.

За Малымі Навасёлкамі – вёска **Вялікія Навасёлкі**, знакамітыя тым, што тут нарадзіўся і пахаваны беларускі паэт, празаік, драматург, публіцыст, мастак, перакладчык, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху Карусь Каганец.

**Каганец Карусь (Кастравіцкі Казімір Карлавіч),** нарадзіўся 10 лютага 1868г. Беларускі паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, мастак, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху. З сям’і памешчыка з Койданаўшчыны, сасланага ў Сібір за ўдзел у паўстанні 1863-1864гг. Вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы, Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. Літаратурную творчасць пачаў у 1893г. У 1890-я – пачатку 1900-х гадоў асобныя апрацоўкі народных паданняў Каганца публікаваліся ў газетах “Минский листок» і “Северо-Западный край”. У 1902-1903гг. удзельнічаў у стварэнні БСГ, распрацоўцы яе праграмы. У сакавіку 1905г. удзельнічаў у рабоце 1-га сялянскага з’езда Беларусі. 19 снежня 1905 г. арыштаваны з групай агітатараў у Койданаўскай воласці Мінскага павета. Да 16 мая 1906г. знаходзіўся ў мінскай турме, вызвалены да суда на парукі па стане здароўя. 2 красавіка 1910г. асуджаны Віленскай судовай палатай на год зняволення ў крэпасці, якое адбываў у мінскай турме. У пачатку 1912г. атрымаў месца аканома ў фальварку Жортаў у Барысаўскім павеце, дзе і праслужыў апошнія 6 гадоў свайго жыцця. Памёр 20 мая 1918г.

Каганец праявіў свой талент у шмат якіх галінах беларускай нацыянальнай культуры: збіраў і апрацоўваў фальклор, пісаў вершы, апавяданні, сцэнічныя творы, публіцыстыку, супрацоўнічаў з газетай “Наша Ніва”. Тэме нацыянальнага адраджэння Каганец прысвяціў вадэвіль “Модны шляхцюк”, які з поспехам ставіўся тэатрам І.Буйніцкага. Апрацаваў кірылічны варыянт першага беларускага падручніка новага часу – “Беларускі лемантар”, перакладаў на беларускую мову навукова-папулярныя працы. Быў адным з пачынальнікаў новага беларускага мастацтва (жывапісу, малюнка, кніжнай ілюстрацыі, палітычнай карыкатуры, скульптуры).

Далей з Навасёлак дарога ідзе праз цэнтр УП “Дзямідавічы” в. Юцкі. Непадалёку ад яе размяшчаецца **в. Навасады,** дзе нарадзіўся беларускі літаратуразнавец Мачульскі В.Ф.

**МАЧУЛЬСКІ Васіль Фёдаравіч,** нарадзіўся 9 жніўня 1893 г. у в. Навасады. Беларускі літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук. Вучыўся ў Варшаўскім універсітэце (1911 – 1915), закончыў Маскоўскі ўніверсітэт (1917). У 1918г. – супрацоўнік белнацкома ў Маскве, у 1919 – 1924 гг. – выкладчык у Слуцку, у 1925 – 1933 гг. – навуковы супрацоўнік Інбелкульта, АН Беларусі. У 1934 – 1971 гг. – выкладчык ВНУ Масквы. Друкаваўся з 1927 года. Удзельнічаў у падрыхтоўцы выдання твораў М,Багдановіча, А.Гаруна. Даследаваў сувязі “Слова аб палку Ігаравым” з беларускім фальклорам. Аўтар артыкулаў, рэцэнзій па праблемах украінскай і рускай літаратуры.

Памёр 29 кастрычніка 1973 г.

У Дворышчы паварочваем на Фаніпаль. Непадалёку ад шашы размяшчаецца вёска **Шпількі**, вядомая тым, што тут нарадзіўся беларускі пісьменнік І.Хадановіч.

**Хадановіч Ігар Піліпавіч,** нарадзіўся 10 чэрвеня 1940 г. у в. Шпількі. У 1957 годзе паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. У 1962 г. пад канец вучобы, быў залічаны на працу ў рэдакцыю газеты “Чырвоная змена”. З 1963 г. працаваў у Мінскім абкоме камсамола, у 1964 - 1966 гг. – у газеце “Літаратура і мастацтва”. Трагічна загінуў 9 студзеня 1966 г. Друкавацца пачаў у 1957 г. (газета “Чырвоная змена”). Аўтар зборнікаў апавяданняў і нарысаў “За акном дождж” (1967), “На досвітку” (1986).

Праязджаем праз г.Фаніпаль у напрамку **в. Грычына**. Тут нарадзіўся і правёў сваё маленства беларускі паэт І.І.Калеснік.

**Калеснік Іван Іванавіч**, нарадзіўся 9 кастрычніка 1932 года у в. Грычына. Беларускі паэт. У 1954 г. закончыў Мінскае педагагічнае вучылішча імя Н.К. Крупскай. Працаваў загадчыкам аддзела газеты «Чырвоная змена» (1954-1961), адначасова завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна. Быў літсупрацоўнікам часопіса «Бярозка, старшым рэдактарам на Беларускім радыё, літсупрацоўнікам часопіса «Маладосць». У 1967 годзе закончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. У 1972-1979 гг. рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1962 г. Першыя вершы надрукаваў у 1951 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборнікаў вершаў «Белыя каштаны», «Пяць сузор'яў», «Калі разам мы» і інш; «Падарожнае»

(вершы, пераклады). Перакладаў творы А.Суркова, М.Ціханава, М. Рыльскага, М. Нагнібеды, З. Нуры, М.Ханінава і іншых паэтаў.

На захад ад Дзяржынска знаходзіцца в. Баравое. Непадалёк ад яе размяшчаецца **в. Косцевічы** – радзіма гісторыка і журналіста М.М.Акаловіча.

**Акаловіч Мікалай Макаравіч**, нарадзіўся 7 жніўня 1926 г. у в. Косцевічы. Гісторык –журналіст. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1961 г. закончыў рэдактарскі факультэт Маскоўскага паліграфічнага інстытута, у 1966 г. Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працаваў вадзіцелем тралейбуса ў Мінску, рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі, галоўным рэдактарам выдавецтваў «Вышэйшая школа», «Навука і тэхніка». Аўтар кніг «Стаяць насмерць», «Яны абаранялі Мінск», «І вораг не прайшоў», «Вызваленне Беларусі: Людзі, подзвігі» і інш.